Радио “Беларусь”

25.01.2018

# Нацыянальная бібліятэка Беларусі рыхтуе маштабны праект да 400-годдзя першага "Буквара"



*фота: www.belarus.by*

Нацыянальная бібліятэка Беларусі рыхтуе маштабны праект да 400-годдзя першага "Буквара". Мэта - вывучэнне, факсімільнае ўзнаўленне і папулярызацыя выдання. "Буквар" выйшаў у свет у 1618 годзе ў друкарні Віленскага Свята-Духава праваслаўнага брацтва. Цяпер у свеце два экзэмпляры гэтай кнігі. Адзін, няпоўны, - у Каралеўскай бібліятэцы Даніі. Другі ў поўным аб'ёме - у бібліятэцы Мідл Тэмпл ў Лондане. Па словах дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Рамана Матульскага, факсіміле плануюць выдаць да Дня ведаў.

Зараз першы "Буквар" у лічбавым выглядзе даступны на сайце Бібліятэкі Мідл Тэмпл. Гэта расказаў намеснік кіраўніка місіі пасольства Вялікабрытаніі ў Беларусі Іан Фокс. Па словах дыпламата, выданне факсіміле старжытнай кнігі мае вялікае значэнне і для Беларусі, і для яго краіны.

Між тым, па словах экспертаў, арыгінал першага "Буквара" можа быць прадстаўлены для часовага экспанавання ў Беларусі. Над гэтым зараз працуюць у Мінску і Лондане.